Бацькаўшчына

WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND“ Цана 1 н. м.

№ 13 (16) 25 красавіка 1948 г. год выданьня 2

АДПРУЖАНЬНЕ?

У ІТАЛІІ

ВЫНІКІ ІТАЛЬЛЯНСКІХ ВЫБАРАЎ

Лёндан (ВВС). Хрысьціянскія дэмакраты (цяперашняя ўрадавая партыя) атрымалі пераважную колькасьць галасоў. Яны здабылі 130 месцаў у сэнаце, усе іншыя партыі — толькі 110. Здабытая важнейшымі партыямі колькасьць галасоў: Хрысьціянскія дэмакраты — 12 750 000 (48,7%), «Народны фронт» (камуністыя) 8 025 000 (30,7%), Незалежныя Сацыялістыя 1 860 000 (7,1%).

КАМУНІСТЫЯ ТКІ МАХЛЯВАЛІ

Рым (ДЭНА). Італьлянскае міністэрства замежных справаў, паводля АФП, падало ў камунікаце, што ў вадным выбарным пункце ў Рыме, у двух пунктах у Нэапалі і ў вадным у Рыёты выкрытыя спробы хвальшаваць выбары з боку сяброў «народнага фронту». Старшыня пункту ў Рыёты сьцьвердзіў, што камуністычныя правернікі выбараў замазалі чэрняю шмат бюлетэняў з галасамі, у тым ліку адзін, апушчаны ведамым сябрам хрысьціянска-дэмакратычнае партыі. Старшыня пастанавіў уважаць усе гэтак замазаныя бюлетэні за запраўдныя. Ён загадаў замяніць гэных правернікаў-парушальнікаў закону іншымі.

ТАЛЬЯТЫ ЎЖО ПРАРАКУЕ

Рым (ДЭНА-Рэйтар). Старшыня італьлянскіх камуністых Тальяты прараку ў будучыні непакоі ў Італіі, калі толькі камуністыя ня будуць дапушчаныя да ўдзелу ў урадзе.

САВЕТЫ СУПРАЦЬ ЗВАРОТУ ТРЫЕСТУ

Лёндан (ДЭНА-Рэйтар). Паводля маскоўскага радыё, СССР уважае за няпрыемлівы той спосаб, у якім пададзеная амэрыканска-француская прапанова пра зварот Трыесту Італіі. Гэтак пададзена ў ноце да ўрадаў Вялікабрытаніі, ЗША й Францыі.

1948 БУДЗЕ ЎРАДЖАЙНЫ

Парыж (ДЭНА-ІНС). Паводля дасюлешніх паведамленьняў з эўрапейскіх краёў на захад ад «зялезнае заслоны», сёлета трэба спадзявацца на куды лепшы ўраджай збожжа, як быў летась. Добры ўраджай, на пагляд назіральнікаў, створыць далейшую запону супраць камуністычнага ціску, які асабліва адчуваюць Францыя, Італія й Грэцыя. Ацэньваюць, што пры нармальным надвор'і ўраджай пшаніцы й жыта перавысіць навет ураджай 1946 г. у вышыні 47,8 міліёнаў тонаў. Паміж 1935 і 1939 г. у Эўропе, за вынняткам СССР, штогоду жалі на 61,6 міліёнаў тонаў збожжа. Сёлета ўвесну ў Францыі, Галяндыі, Швэдыі й Даніі павялічыўся высеў збожжа, тымчасам як у Грэцыі й Бэльгіі зьменшыўся.

АПОШНІМ ЧАСАМ

* Італьлянскі прэм'ер Дэ-Гаспары заявіў, што камуністыя ня будуць дапушчаныя ў італьлянскі ўрад.
* Армія ЗША паведаміла, што пэўны лік ейных баёвых злучэньняў пасылаецца на Аляску «на летнія практыкаваньні».
* Морскі аддзел міністэрства абароны ЗША паведаміў, што заплянаванае наведаньне колькімі амэрыканскімі ваеннымі караблямі Портсмуту (Вялікабрытанія) адкладаецца «із стратэгічных прычынаў». Наведаньне гэтымі-ж караблямі Нарвэгіі адбудзецца.
* Адзін савецкі самалёт «змушана сеў» ля турэцкага чарнаморскага порту Сынопу.
* Агульны зьезд ЗН аднагалосна прыняў Бірму ў сябры ЗН.
* У Вялікабрытаніі зьнятая кара сьмерці на пяць год.
* У Трыесьце адбыліся ангельска-амэрыканскія манэўры.
* У Нямеччыну прыляцела 28 паветраных звышцьвярдыняў тыпу Б-29.
* У Вугоршчыне і ў Чэхаславаччыне пачынаецца «дабраахвотнае зьліцьцё» сацыял-дэмакратычнае партыі з камуністычнай у «вадзіную работніцкую партыю».

ЗА СПРАВУ МІРУ

НАДЗВЫЧАЙНЫ ЗЬЕЗД ЗН

Нью-Ёрк (ДЭНА). Пачаўся надзвычайны зьезд ЗН у справе Палестыны. За старшыню зьезду абраны кіраўнік аргентынскае дэлегацыі Хозэ Арсэ. Адчыняючы другое паседжаньне зьезду, бразылійскі дэлегат Муніц, паводля Рэйтар, заявіў, што прэстыж ЗН вельмі пацярпеў. Надзеі шмат якіх народаў на закон-ЗН сяньня прашытыя няпэўнасьцямі.

РЭЗАЛЮЦЫЯ АБ ЗАМІР'І

Нью-Ёрк (ДЭНА-Рэйтар). Пасьля цэланочнага паседжаньня, Рада Бясьпекі ЗН ухваліла рэзалюцыю пра замір'е ў Палестыне. Галасаваўся кожны артыкул рэзалюцыі ўпаасобку. Артыкул, у якім абодвы бакі заклікаюцца спыніць усякую вайсковую дзейнасьць і ня сьцягваць у Палестыну ніякіх узброеных сілаў, ухвалены аднагалосна. Пры галасаваньні некаторых артыкулаў устрымваліся СССР і «Украіна».

АД ЭЎРАПЕЙСКАЕ ВУНІІ — ДА АТЛЯНТЫЧНАЙ

Атава (ДЭН-Рэйтар). Бэльгійскі прэм'ер і міністар замежных справаў Спаак будзе весьці перамовы з канадзкімі дзеячамі пра магчымае пашырэньне Заходняэўрапейскае вуніі да Атлянтычнае, у якую ўвайшлі-б Канада й ЗША.

ХАРТЫЯ ЭКАНАМІЧНАГА СУПРАЦАЎНІЦТВА

Парыж (ДЭНА-Рэйтар). Пад старшынством брытанскага міністра замежных справаў Бэвіна адчынілася новае пасаджаньне парыскае канфэрэнцыі ў справе пляну Маршала.

Міністры замежных справаў 16 краёў пляну Маршала й хаўрусьніцкія галоўнакамандуючыя заходніх акупацыйных зонаў Нямеччыны падпісалі хартыю эканамічнага супрацаўніцтва Эўропы. Мэта хартыі, якая складаецца з 28 артыкулаў і 7 пратаколаў, сфармуляваная ў 11-м артыкуле: «праз эканамічнае супрацаўніцтва дзяржаваў, што падпісалі, дасягнуць стабільнасьці эўрапейскае гаспадаркі».

АДМІНІСТРАТАР АМЭРЫКАНСКАЕ ПАМОГІ

Вашынгтон (ДЭНА-ІНС). Прэзыдэнт Труман падпісаў прызначэньне дырэктара кампаніі Студэбэкер Гофмана на адміністратара замежнае памогі ЗША.

ПЛЯН МАРШАЛА Ў ДЗЕІ

Вашынгтон (ДЭНА-Рэйтар). Адміністратар пляну Маршала, П. Гофман паведаміў, што ў дадатак да пастаноўленых ужо пастачаньняў на суму 37.877.000 даляраў у Італію, Францыю, й Галяндыю пасылаюцца харчы, вугальле й іншыя тавары на суму 20.424.000 д.

ВАКОЛ ПАВЕТРАНАЕ КАТАСТРОФЫ

Лёндан (ДЭНА). Брытанскі міністар замежных справаў Бэвін, паводля Рэйтар, паведаміў у парлямэньце, што Вялікабрытанія будзе дамагацца адшкадаваньня за страту пасажырскага самалёту «Вікінг», які загінуў над Бэрлінам із 14-ма пасажырамі пры сутычцы з савецкім лавецкім самалётам. «Вынікі дасьледваньня самалётнае катастрофы паказваюць, — заявіў Бэвін, паводля АФП, — што, праўда, тут ідзець пра няшчасны выпадак, аднак віна ні ў якім разе ня можа быць прыпісаная пілёту брытанскага самалёту».

У паведамленьні брытанскае дасьледнае камісіі сьцьвярджаецца, што прычына сутычкі крыецца ў заходваньні савецкага пілёта, які ня трымаўся аэранаўтычных вызначэньняў і асабліва ўстанаўленьняў, прынятых чатырма дзяржавамі, у тым ліку й СССР.

«КАНТРОЛЬ» У АЎСТРЫІ АДКЛІКАНЫ

Вена (ДЭНА-Рэйтар). Савецкі высокі камісар у Аўстрыі, генэрал Курасаў, выдаў загад, паводля якога асобы брытанскіх акупацыйных узброеных сілаў, падаючыся зь Вены ў брытанскую акупацыйную зону, як і дасюль, могуць пераходзіць дэмаркацыйную лінію толькі з выстаўленымі брытанскай уладай шэрымі пашпартамі, не патрабуючы паказваць пашпартоў з фотакарткамі. Загад Курасава выйшаў пасьля войстрага пратэсту брытанскага высокага камісара ген. Галёвэя.

ВІТАЮЧЫ ЗЬЕЗД

Сяньняшнім перадавым артыкулам мы маем асаблівую прыемнасьць прывітаць зьезд давяроных абраньнікаў нашае нацыянальнае эміграцыі ў Нямеччыне — дэлегатаў, упаўнаважаных свабодным волявыяўленьнем масы гэтае эміграцыі да перавыбараў нашага нацыянальнага прадстаўніцтва ў Нямеччыне — Беларускага Цэнтральнага Дапамаговага Камітэту.

Прадстаўніцтва нашае эміграцыі ў Нямеччыне — інстытуцыя яшчэ маладая, хоць, зрэшты, ня шмат маладзейшая за ўсю гэтую эміграцыю. Паўстала яна стыхійна, але зусім заканамерна, у моц прыроднае патрэбы нацыянальнага самазахаваньня й самаабароны на чужыне ў вабставінах найзацяцейшых пасяганьняў ня толькі на духовую існасьць, але й на само фізычнае існаваньне катаваных гістарычнаю несправядлівасьцяй выгнанцаў з краіны, аддаўна й блізу бязупынна адзначанае цяжкім таўром «Забранага Краю». Запачаткавалі гэтае прадстаўніцтва людзі, якія найлепш адчувалі гэную прыродную патрэбу й знайшлі ў сабе найбольш мужнасьці адразу-ж, не палохаючыся й не вагаючыся, паставіцца ёй на адданую й ахвярную службу. Закладаючы першыя мясцовыя нацыянальныя камітэты, пашыраючы іх да акруговых і зонных, канцэнтруючы нарэшце ў цэнтральным, людзі гэтыя не чакалі на фармальныя паклікань(і), упаўнаважаньні ці выбары, а браліся адразу за работу й рабілі, як толькі маглі, ды наагул, як толькі можна было. І вынікаў гэтае работы — зарганізаваных нацыянальных лягераў і групаў, выступленьняў перад уладамі й арганізацыямі, прадстаўніцтва ў міжнацыянальных эмігранцкіх арганізацыях, здабыцьця нацыянальнае ліцэнзіяванае прэсы, стварэньня нацыянальна-культурных пляцовак у школьніцтве, мастацтве і г. д. і г. д. — не адбера ніхто ад нас, ад нашае агульнай нацыянальнай справы на эміграцыі, ды, нарэшце ад імя й гонару гэных людзей упаасобку. Калі гэтыя вынікі можа й не заўсёды супастаўныя да здабыткаў, дасягненых іншымі нацыянальнасьцямі на эміграцыі, ды затое яны сьціслa прапарцыянальныя да магчымасьцяў эміграцыі нашае, да моцы інтэлігентнага прапластаваньня ў ёй, да ступені нацыянальнае сьведамасьці нашае народнае масы, бяручы яе йшчэ ў ейным папярэднім стане на Бацькаўшчыне, нарэшце, — да самое колькасьці й магчымасьцяў гэных піянэраў-ініцыятараў.

Цяпер гэтыя людзі, пакліканыя часам і ўсьведамленым абавязкам, свой мандат-упаўнаважаньне, атрыманае, можна сьмела сказаць, ад самое гісторыі здаюць зьезду зусім свабодна й паводля ўсіх дэмакратычных нормаў выбраных прадстаўнікоў нашае эмігранцкае масы ў Нямеччыне з усіх куткоў ейнага расьцярушаньня тут. Здача гэтага мандату адбываецца не запозна, бо нельга было яе, бяз рызыкі для дабра справы, правесьці тады, калі ўся арганізацыйная праца эмігрантаў у Нямеччыне наагул магла праходзіць адно ў паўлегальных абставінах, ані датуль — і гэта найважнейшы ўжо для нашае канкрэтнае нацыянальнае сытуацыі мамэнт — пакуль не раскрыла свайго запраўднага аблічча (ці пакуль не ўдалося яго раскрыць) у ваччу кажнага, хто толькі мае вочы, каб бачыць і вушы, каб чуць — глыбака запушчаная, дэмагагічная й дынамічная антынацыянальная чужацкая дывэрсія. Тварэньне безадказнымі адзінкамі й групкамі новага г. зв. «цэнтральнага беларускага прадстаўніцтва» на зусім голым месцы, адкідаючы ўсе здабыткі папярэдняе працы (хоць і маўкліва карыстаючыся найважнейшымі зь іх ды стараючыся выкарыстаць усе наагул), — пры поўнай магчымасьці ўсім узяць удзел у як найрадыкальнейшым перафармаваньні на строга дэмакратычных асновах прадстаўніцтва ўжо традыцыйнага, заслужонага і ўсебаковага ўвязанага як у нутраным, так і ў вонкавым дачыненьні, навет пры адкрытым запрашэньні да гэткага ўдзелу (гл. хоць-бы «Бацькаўшчыну» № 8 (11) — гаворыць само за сябе, ставіць апошнюю кроку над і, адхінае апошні рубочак мімі-
апошнюю кропку над і, адхінае апошні рубочак мімі-
І ў гэтым — вялікі пазытыўны мамэнт для змаганьня:

Зьезду нашага эміграцыйнага прадстаўніцтва - спорнай працы!

станы ягоныя канчальна разьмяжоўваюцца, вораг нутраны сам раскрывае сваю вонкавасьць, застаецца толькі проба сілаў. Баяцца таго, што пэўная частка ня зусім усьведамленае масы дасца яшчэ нейкі час сябе баламуціць і эксплёатаваць — значыла-б наагул ня мець пэўнасьці, ці хоць веры ў праўднасьць усяе нашае нацыянальнае справы. Прагаяць гэтую боязь, калі ў каго яна ёсьць, працаю й толькі працаю над нацыянальна - палітычным усьведамленьнем і гуртаваньнем — адзіны мужны й чэсны выхад для ўсіх, хто не гатовы, ці псыхалёгічна няздольны да змаганьня. Бо толькі праца й змаганьне — ад пачатку назначаныя й цірас бліскуча выпрабаваныя сьцежкі-дарожкі нашага нацыянальнага руху.

У працы й змаганьні ўзрастала й нашае нацыянальнае прадстаўніцтва БЦДК, у працы й змаганьні будзе дужэць яно й надалей. Няхай сабе шмат каму шмат што ў гэным змаганьні можа здацца лішнім і магчымым да абміну ці ліквідацыі. Пэўна-ж, эканомія сілаў мусіць быць заўсёды і ўсюды, асабліва пры нашым такім небагацьці на іх. Але кажнае змаганьне вымагае й ніяк неабмінных выдаткаў ды ахвяраў. Калі толькі верыцца ў праўднасьць усяе справы — нельга ня верыць і ў тое, што выдаткі гэныя аплацяцца й акупяцца.

Аднак, таксама шмат каму, і найбольш асобам, далёкім ад сяньняшняга актыўнага рэчышча руху, найчасьцей людзям простым і ціхамірным — усё нашае цяперашняе змаганьне, нутранае сваем месцам, хоць і вонкавае паходжаньнем, кіраваньнем ды скіраваньнем — выдаецца нейкім бязмэтным, дробным, мо нат асабістым і аж проста ледзь ня сьмешным. У папярэднім нумары «Бацькаўшчыны» мы мелі нагоду й прыемнасьць зьмясьціць вялікі й шчыры «ліст да беларускае інтэлігенцыі» нашых суродзічаў з аднаго лягеру ў Ангельскай зоне. І хоць аўтары ліста добра бачаць, хто цяпер і каго атакуе ў змаганьні, хоць яны добра клічуць «да згоды» ўсіх суродзічаў, што маглі-б быць карыснымі цэлай нацыі, а ня толькі самым сабе ці, яшчэ горш, адвечным варагам Бацькаўшчыны — усё-ткі тое нашае змаганьне ў іхным вачху выглядае проста «дзяленьнем пустога мяха».

Пэўна, здалёк і без развагі гэтак зусім можа здавацца. Бо калі той «мех» разумець у чыста-матар'яльным сэнсе, дык ён і запраўды ў нас даволі-ткі пуставаты. Але й тут трэ было-б задумацца найперш над некатарымі пытаньнямі: чаму ўсё-ж да гэтага «пустога меху» так дабіваюцца цяпер шырака й даўно ведамыя спэцыялістыя якраз ад «мяхоў» поўных? Чаму ня цікавіліся яны ім тады, калі «мех» і запраўды быў пусьцеькі, і трэба было цягаць у яго, дый яшчэ з гарача прыску, першыя каштаны — зьбіраць у гурт, выдзіраць із чужых лапаў запалоханых і здэзарыентаваных суродзічаў? Ці ня чуюць іхныя дазнаныя насы выразнага паху нечага істатнейшага — ня печаных каштаноў (ці, калі ўжо, «нацыянальнай формаю» карыстацца, дык бульбы, хіба), а нейкіх — і то нелапых — скварак? Вунь пачынаюць газэты як у бубен біць аб недалёкім прызнаньні замежных эміграцыйных урадаў, сымпаты — і ня толькі адны плятанічныя — да паняволеных бальшавізмам растуць увачавідкі. І раптам «мех можа прарвацца» — ня нашая пуставатая яшчэ торба з тымі бульбінамі, а тугі мех сусьветнае сілы й можнасьці. Тады адно — падстаўляй гэныя торбы й торбачкі ды завязвай — ці мо лепш, не «падстаўляй», а «прадстаўляй» добра напрактыкаванымі ў гэтакіх «мехавых» справах «прадстаўніцтвамі» — і стане й самому, і дзеткам, і добрым суседкам...

Запраўднае нашае нацыянальнае прадстаўніцтва — нашыя дапамаговыя камітэты з БЦДК на чале — усёй сваёй дасюлешняй працай, адданасьцяй, ахвярнасьцяй і нарэшце — беднасьцяй, спрычыненай мо й ня зусім ужо пахвальнай непатрабавальнасьцяй (асабліва прыраўнаўшы да падобных установаў іншых нацыяў, што выяўляюць напару надзвычайную энэргію ў спаганяньні розных нацыянальных складак ды падаткаў) — сьветчаць аж занадта, як далёка яны ад падобных «мехаватых» канцэпцыяў. Дык усё тое, што тут ёсьць, ці быць можа — сяньня аддаецца да рукі прадстаўнікоў самое масы эміграцыі. І, найгалаўнейшае — аддаецца ў гэтыя-ж даваронныя рукі ня толькі «мех» які-небудзь, пусты ці поўны, рагожавы ці сап'янавы — а нічым ня сплямлены сьцяг нацыянальнае ідэі. Аддаецца ня з тым, каб перашсьць яго ў якую-такую сабе торбу, а каб несьці й далей у тэйжа чысьціні й на тэй-жа вышыні, галоўна — наперад і наперад! Бо мы ў змаганьні баронім толькі гэты сьцяг, толькі пад ім наступаем, толькі за яго ходземся й ахвяруемся. І будзем ходацца, каб ня лучыў ён у якія, аб усе «мяхі» сьвету зацухмоленыя лапы, каб ня выслізнуў зь іх ды не пайшоў на паганыя анучы да чужацкіх і ворагавых ботаў.

А пакуль — аддаючы чэсьць тым, што горда несьлі гэны сьцяг дасюль тут, на чужыне, вітаем тых новых, што панясуць яго далей, можа аж да перамогі — зычым ім гэтага ад усяго шчырага сэрца, жадаем ад поўнае добрае волі!

ЧАН-КАЙ-ШЫ — ПРЭЗЫДЭНТ КІТАЮ

Бад Наўгайн (ДЭНА). Генэралісымус Чан-Кай-Шы абраны нацыянальным зборам на прэзыдэнта кітайскае рэспублікі. За яго было пададзена 2 430 галасоў, адзіны ягоны контркандыдат здабыў усяго 269. Чан-Кай-Шы, паводля Рэйтар, спачатку адмаўляўся прыняць выбар і згадзіўся адно пад умовай, што прэм'ер-міністрам ягонага ўраду будзе былы пасол у Вашынгтоне, д-р Гу Шын.

АДУСЮЛЬ

У КАЛЮМБІІ СУПАКОЙВАЕЦЦА

Багота (ДЭНА). Як паведамляе АФП, маўкліва праводжанае ад часу ўтварэньня новага калюмбійскага ўраду палітычнае замір'е афіцыйна аформленае ў пісьмовай умове між кансэрватарамі й лібэраламі. Абедзьве партыі заявілі аб сваёй гатовасьці да цеснага супрацоўніцтва. Праўдаўр лібэралаў, пасьля даўгіх перамоваў з кансэрватарамі, абняў міністэрства нутраных справаў, і яшчэ пяць міністэрстваў таксама перададзена лібэралам. У добра паінфармаваных палітычных колах мяркуюць аднак, што лібэралы й надалей будуць дамагацца зрачэньня прэзыдэнта Пэрэца, хочучы здабыць гэтае становішча, хоць і дэмакратычным шляхам, без ужыцьця гвалту.

Як падае Рэйтар, пры далейшых непакоях у сталіцы забітыя 3 жаўнеры й 1 цывільны. Паводля няспраўджаных вестак, армія маніцца падпаліць апошнюю базу рэвалюцыянэраў — гатэль «Гранаду» .Ад пачатку непакояў у Багоце страціла жыцьцё 500 асобаў.

НАЙБОЛЬШАЕ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА

Багота (ДЭНА-Рэйтар). Амэрыканскі міністар замежных справаў Маршал у сваёй прамове перад дэлегатамі панамэрыканскае канфэрэнцыі характарызаваў калюмбійскі бунт як першае большае камуністычнае прадпрыёмства ў заходняй паўкулі ад часу канца вайны.

І УРУГВАЙ ЗАБЯСЬПЕЧВАЕЦЦА

Монтэвідэо (ДЭНА-Рэйтар). Хоць цяпер у Уругваі й пануе поўны супакой, тут ужытыя мерапрыёмствы перасьцярогі супраць магчымае камуністычнае акцыі. Войску загадана заставацца ў сваіх памешканьнях, паліцыі — быць напагатове.

АРГАНІЗАЦЫЯ АМЭРЫКАНСКІХ ГАСПАДАРСТВАЎ

Багота (ДЭНА). Панамэрыканская канфэрэнцыя, што аднавіла сваю працу на месцы, у Багоце, ухваліла 11-ма галасамі супраць 10-х новы назоў «Арганізацыі амэрыканскіх гаспадарстваў» для міжамэрыканскае сыстэмы.

СПРОБА АТОМНАЕ ЗБРОІ

Вашынгтон (ДЭНА-Рэйтар). Як афіцыйна паведамлена, на атоле Энівэтак у Ціхім акіяне была зробленая спроба атомнае зброі. Гэта — першая спроба ад часу сьпінуцыя атомнае бомбы на атоле Бікіні. Зь меркаваньняў бясьпекі пра тэрмін спробы не паведамлялася.

НОВАЯ ЗБРОЯ

Нью-Ёрк (ДЭНА-Рэйтар). Амэрыканскі піянэр у галіне авіябудаўніцтва, Глен Л. Мартын, заявіў, што Амэрыка вырабіла новую наступальную зброю, яшчэ дзяйнейшую за атомную бомбу. Гэтая зброя — «радыёактыўныя хмары». Мартын не падаў ніякіх бліжэйшых падрабязнасьцяў, адно сказаў: «Не хацеў-бы я й пасьля гадоў наведаць гаспадарства, у якім была-б ужытая гэтая зброя».

НА ПАВЕТРАНЫЯ СІЛЫ

Вашынгтон (ДЭНА-ІНС). На запатрабаваньне прэзыдэнта Трумана кангрэс ухваліў асыгнаваць безадкладна 822 міліёны даляраў на ўзмацненьне амэрыканскіх паветраных сілаў. Гэта частка трохміліярдавае сумы, запатрабаванай прэзыдэнтам у прамове 1. 4. 1948.

ФРАНЦУСКА-БРЫТАНСКАЯ ПАВЕТРАНАЯ ЎМОВА

Парыж (ДЭНА-ІНС). Падпісаная ўмова між Францыяй і Вялікабрытаніяй, паводля якое вайсковыя самалёты абодвух гаспадарстваў маюць права карыстацца лётавішчамі другога краю.

З ДВУХ БАКОЎ РАЗГАНЯНАЕ «АДЗІНСТВА»

Лёндан (ДЭНА-Рэйтар). Сход заснаванае Асвальдам Мосьлі арганізацыі «Новы рух адзінства» быў разагнаны паліцыяй. Пяць асобаў арыштавана.

Сход, які павінен быў пачаць выбарную кампанію за кандыдата «Руху адзінства», трываў усяго 10 часінаў. Прыйшлі на сход у бальшыні маладыя жыды, якія пры адчыненьні сходу яшчэ захоўвалі спакой. А тады раптам пачуўся выгук: «Далоў фашыстых!», і натоўп рынуў наперад, пачаў ламаць і рваць шыльды й плякаты. Калі паліцыя абставіла сход, з натоўпу пачуліся выгукі: «Зачыняйце сход і йдзеце назад у Нямеччыну!» Адзін з арганізатараў выгукнуў: «Глядзеце, што робіцца ў Чэхаславаччыне!» Натоўп ізноў рынуўся наперад, але быў адціснуты паліцыяй, якая абвесьціла, што сход мусіць быць зачынены.

СЯРОД АНЕЛАЎ МІРУ...

Осьлё (ДЭНА-Рэйтар). У сьпісе кандыдатаў на нобэлеўскую прэмію міру, абвешчаным нарвэскім інстытутам Нобэля, побач зь міжнародна знанымі дзяржаўнымі дзеячамі й палітыкамі ёсьць і маршал Сталін, а таксама Молатаў, Бэнэш... Із запраўдных дзеячоў міру на сьпісе — забіты нядаўна Магатма Ганды, папа Піус XII, прэзыдэнт Труман і інш.

САВЕТЫ ПЛЯНУЮЦЬ МАНЭЎРЫ

Бэрлін (ДЭНА). Ліцэнзіяваная Французамі бэрлінская газэта «Кур'ер» падае, што савецкая армія плянуе ў сваёй зоне пашыраныя веснавыя манэўры і з гэтай мэтай праводзіць вялікія перакіданьні войскаў на галоўнай чыгуначнай лініі з Франкфурту на Одры ў кірунку на Турынгію. У ваколіцы Майнінгену ў розных сёлах раскватараваліся танкавыя злучэньні. Апрача таго, спасьцерагаюцца згрмаджаньні сярэдняцяжкіх танкаў у лясох паўз дарогі. Вялікі лік гэтых танкаў прывезены сюды ў драўляных скрынях у вадмысловых таварных вагонах зь нязвычайна вялікай цяжкаёмістасьцяй. Аддзелы, пераважаныя праз станцыю Сэдын ля Бэрліну ў кірунку на Турынгію, складаюцца пераважна з жаўнараў малодшых год. Запыненьні вайсковых транспартаў на чыгуначных станцыях абмежаныя да мінімуму.

РЭХА САКАВІКА

САКАВІК У АЎСТРЫІ

25. 3. беларуская калёнія ў Кірхгайме (Аўстрыя) адсьвяткава трыццатыя ўгодкі Акту 25 Сакавіка 1918 г. Адпаведны рэфэрат прачытаў сп. Я., было прапяяна шмат нацыянальных і народных песьняў («Мы выйдзем шчыльнымі радамі», «Не загаснуць зоркі ў небе», «Люблю наш край», «Мы бойкая моладзь», «У гушчарах», «Падняты родны сьцяг дзяржавы», «Чуеш гоман», «Лявон», «Беларуская зямелька», «Як шырока і далёка», «Забраны ў няволю з Забранага Краю» і г.д.).

ГАЗЭТЫ ДП ДА САКАВІКА

Апрача пералічаных намі ўжо раней газэтаў ДП, цяпер зьмясьціла артыкул Я. Каранеўскага да 30-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі й польская газэта «Lech» у сваім № 19 (39) ад 17. 4. 48.

ПАДЗЯКА

З нагоды ўгодкаў 25 Сакавіка Цэнтраля Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў атрымала павіншаваньні й прывітаньні ад паасобных асобаў і арганізацыяў.

ЦБСА просіць рэдакцыю «Бацькаўшчыны» перадаць на балонах газэты сваю падзяку й пажаданьне спаўненьня ўсяго таго, што пісалася ў павіншаваньнях, наступным асобам і арганізацыям:

1. Генэральная Рада Саюзу Беларусаў у Бэльгіі,
2. А. Леў Гарошка,
3. А. Ч. Сіповіч, Старшыня БХАА «Жыцьцё»,
4. Беларускі Дапамаговы Камітэт Брытанскае Зоны Нямеччыны,
5. Беларускае Студэнцкае Згуртаваньне ў Марбургу,
6. Урад Беларускага Дапамаговага Згуртаваньня на францускую Зону Нямеччыны,
7. Беларускі ДП-лягер Віндышбэргэрдорф,
8. Адміністрацыя й жыхары лягеру Міхэльсдорф,
9. Беларускі Камітэт на Амэрыканскую Зону Нямеччыны,
10. Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі.

Старшыня ЦБСА (подпіс)
Сакратар (подпіс)

ДА ПРЫЗНАНЬНЯ ЗАМЕЖНЫХ УРАДАЎ

У папярэднім нумары «Бацькаўшчыны» была зацемка «Перад прызнаньнем эміграцыйных урадаў», заснаваная на вестках з украінскае прэсы. Цяпер падаём выказваньне ў гэтым пытаньні францускае газэты «Самды Суар». Гэтая, адна з найбольшых францускіх газэтаў, паведамляючы, што ў Вашынгтоне абмяркоўваецца пытаньне пра прызнаньне ЗША замежных урадаў паняволеных саветамі краёў, піша: «Наступны агульны зьезд ЗН адбудзецца, відавочна, у верасьні сёлета ў Парыжы, і трэба чакаць, што на гэтым форуме выступяць калі не прадстаўнікі самых прыгнечаных народаў, дык іхныя прыяцелі, лік якіх ува ўсім сьвеце што дзень, то большае. Гэтыя прыяцелі могуць пападаць на абмеркаваньне прапанову пра актыўнае ўмяшаньне ў нутраныя справы паняволеных краёў з мэтаю аднаўленьня іхных законных правоў на аснове статуту ЗН. Як тады гэткае пытаньне мусіць быць разьвязанае? Ці можа СССР, што сілаю падпарадкаваў сабе гэтулькі гаспадарстваў і ўстанавіў у іх рэжым тэрору, заставацца яшчэ сябрам арганізацыі Задзіночаных Нацыяў? Ці ня будуць замежныя ўрады захопленых СССР краёў у куды большай меры запраўднымі выразьнікамі праўдзівых народных пагляду, чымся ўрады, што існуюць у самых гэных краёх? Ці ня змушае гэткі стан прызнаць замежныя ўрады? Разгляданае цяперашнім часам Радаю Бясьпекі чэхаславацкае пытаньне, відавочна, асаблівых вынікаў не дасць. Нагвалт трэба, каб усе прыгнечаныя народы разам дамагаліся аднаўленьня праўды й права. Ужо цяпер можна сказаць, што настрой у Задзіночаных Штатах вельмі спрыяльны дзеля прызнаньня замежных урадаў, якія ўжо ёсьць і яшчэ чакаюцца. Ужо цяпер уцякацыя групы з усходніх і цэнтральных гаспадарстваў становяць сабою пэўную сілу, зь якою трэба лічыцца... Дзейнасьць эміграцыі становіць ужо ладную сілу. Трэба думаць што гэтая праца бліжэйшай будучыняй стане на абмеркаваньне ў ЗН, і ейныя вынікі выявяцца ў узмацненьні партызанскае вайны супраць саветаў, якая яшчэ больш узмоцніцца ў выпадку прызнаньня замежных урадаў. СССР будзе пастаўлены ў наддзвычай цяжкі стан, пры якім ягоная апараза ў узброеным канфлікце забясьпечаная».

ЗВАРОТ СЛАВАКОЎ ДА РАДЫ БЯСЬПЕКІ ЗН

Старшыня Славацкае Нацыянальнае Рады ў Лёндане (заснаванай у 1943 г.) Пётра Прыдавок 15. 3. 1948 г. выслаў наступную тэлеграму Радзе Бясьпекі Задзіночаных Нацыяў:

«Асуджаючы з жахам і агідай камуністычны путч у Славаччыне ад імя славацкае нацыі, ад шчырага сэрца падтрымваем ініцыятыву чылійскага дэлегата дасьледваць цяперашнія падзеі там. Мы таксама прапануем дасьледваньне ашуканства Бэнэша - Готвальда, што зламала самастойнасьць Славаччыны. Як найстанаўчэй адмаўляем мы такому Папанэку, такому Слявіку ці іншаму якому г. зв. чэхаславацкаму бэнэшаўцу права гаварыць ці дзеяць ад імя славацкага народу. Мы дамагаемся правядзеньня кантраляванага плебісцыту, пры вылучэньні Чэхаў і Саветаў, каб у згодзе з § 3 Атлянтычнае Хартыі выявіць волю славацкае нацыі да гаспадарстваўскае самастойнасьці».

ЗА СУСЬВЕТНУЮ МОВУ

Брусэль (ДЭНА-Рэйтар). Спадарыня Элеанор Рузвэльт у сваёй прамове перад краёвай радай бэльгійскіх жанчынаў выказалася за ўвядзеньне агульнае мовы для цэлага сьвету, як спосабу для лепшага міжнароднага паразуменьня.

СПРАВЫ ДП

З АМЭРЫКАНСКАЕ ЗОНЫ Ў АНГЕЛЬШЧЫНУ

Як паведамляе ПК ІРО, дасюль ужо выехала на працу ў Ангельшчыну 10.000 ДП. Апошнім часам ад'ехала зь Мюнхэну 500 ДП (420 мужчынаў, 80 жанчынаў — адна з найбольшых дасюль групаў) і адначасна із Штутгарту 350 ДП.

Ад пачатку свайго разгортаньня ў Амэрыканскай зоне ў кастрычніку летась, брытанская праграма набіраньня ДП на працу ўсьцяж здабывала сабе больш й больш разгон. На працягу 1947 г. выехала ў Вялікабрытанію ўсяго 2.852 ДП, у студзені сёлета ўжо 1.862, у лютым — 2.073 і ў сакавіку — 2.398.

Прадстаўнік брытанскага міністэрства працы пры Галоўнай Гасподзе ПК ІРО на Амэрыканскую зону, мр. Г. Гарднэр, падчырквае зноў, што брытанскі плян асяленьня ДП можа знайсьці сваю мяжу толькі ў прыймальнай здольнасьці брытанскае прамысловасьці (г. зн. будуць браць датуль, дакуль прамысловасьць будзе здольная прыймаць на працу). «Адней толькі тэкстыльнай прамысловасьці трэба 30-40.000 новых работнікаў, — мяркуе ён, — і вялікую колькасьць працаўнікоў шукаюць яшчэ шахты, сельская гаспадарка й цяжкая прамысловасьць».

У КАНАДУ Й АЎСТРАЛЮ

У часе між 5-25 красавіком з Амэрыканскае зоны павінны былі выехаць каля 700 ДП у Канаду й каля гэтулькі-ж у Аўстралію.

15 красавіка 116 перасяленцаў у Канаду адплыло з Брэмэну на параплаве «Марына Фалькон» (усе яны із Штутгарцкага пераходнага лягеру), яшчэ 127 адплыло 17. 4. на параплаве «Сабельскі» з Канэсу. 14 і 17 4., таксама праз Канэс, пакінулі Эўропу, плывучы ў Канаду, 510 перасяленцаў з Буцбахскага цэнтру. Гэта ўсё, галоўна, будаўнікі чыгуначных ліній, ліўцы алюміню, шахцёры, хатнія работніцы, краўцы й блізкія сваякі канадзкіх грамадзянаў.

Запісаныя ў Аўстралію ўцекачы 11. 4 адбылі з Бамбэргу, каб за 8 дзён адплыць із Вэнэцыі на караблі «Генэрал Старгіс». Із гэтым чацьвертым вялікім транспартам у Аўстралію туды перасялілася агулом 3.431 ДП. Яны не завэрбаваныя адразу на пэўную азначаную працу, а знойдуць адпаведныя месцы для яе адно высадзіўшыся ў Аўстраліі. Мужчыны прызначаюцца галоўна на сельскую гаспадарку й будаўніцтва, жанчыны — на хатнюю працу й да пісаньня.

У КАНАДУ НА СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ

Упрашыню сельскагаспадарскім работнікам даецца нагода выехаць у Канаду з Амэрыканскае зоны. Паводля новага канадзкага перасяленскага пляну, павінны набірацца 500 сельскагаспадарскіх работнікаў між 18-45 г.г., пажадана нежанатых і бесьсемейных. Апрача таго, набіраюцца яшчэ 50 жанатых параў таго-ж веку. Паводля статыстыкі ІРО, у лягерах Амэрыканскае зоны жывець больш за 13.000 сельскагаспадарскіх працаўнікоў.

Дасюль знаходзілі дарогу ў Канаду хатнія работніцы, лясныя работнікі, агульныя падпаможныя работнікі, работнікі адзежнае прамысловасьці, работнікі капальняў, будаўнікі чыгунак, муляры, ліўцы алюміню й блізкія сваякі канадзкіх грамадзянаў. Мяркуюць, што й некаторыя з набіраных цяпер сельскагаспадарскіх работнікаў падпадаюць пад катэгорыю блізкіх сваякоў.

Ад Рэд. Усе пададзеныя тут весткі пра перасяленьне ўзятыя зь «Інфармацыйнае Службы ІРО», № 30.

НА БАЗЕ ПРАКТЫЧНАГА ХРЫСЬЦІЯНСТВА

«Брацкае таварыства Гутэр» у Прымарыв'еры (Парагвай) запрашае 100 ДП падзяліць зь ім жыцьцё на яголным селішчы з 20.000 акрамі зямлі, «у поўным сяброўсьцьве на базе практычнага хрысьціянства».

Таварыства займаецца галоўна земляробствам і жывёлагадоўляй, некаторыя сябры, якія паходзяць з 11 розных нацыянальнасьцяў — тэхнікі, шорнікі, такары, сталяры — вядуць тартак і цагельню, або займаюцца хатняю працай, вучэньнем, даглядам дзяцей і хворых ды адміністрацыйнай работай.

Ніводзін сябра не дастае заробатку або якое-небудзь прыватнае собскасьці; усё заробленае йдзець на грамадзкія мэты й на ўтрыманьне Таварыства.

Перадумова для перасяленьня на гэтай аснове — каб будучы сябра забавязаўся падзяліць із грамадой ейнае дасюлешняе жыцьцё й адпрацаваць прынамся год у ёй, пасьля чаго перад ім вольны выбар пакінуць каленію, калі ён знойдзе ў Парагваі нешта, сабе адпаведнае.

Два прадстаўнікі Таварыства, сп. сп. Эванс і Зумпэ, аб'яжджаюць цяпер 7 АРЭА-ТЫМ'аў, аглядаючы ДП. Асабліва пажаданыя ім удовы зь дзецьмі, але вароты каленіі адчыненыя кажнаму, хто запраўды хоча весьці простае, брацкае жыцьцё.

М. ВЯРБА

СВАЮ САБЕ ЗБУДУЕМ ХАТУ

Няхай «фанатыкі» мы будзем,
Пракляты вамі назаўсёды...
Таго, што маюць усе народы,
Няхай мы тут і не здабудзем.

Але да мэт сваіх пайдзем,
Хаця-б патроіць трэба страты,
І сьцяг, шчэ прадзедамі ўзьняты,
За незалежнасьць панясем.

Мы не бяром Маскву, Варшаву,
Ня трэба нам Сібір бязьмежны —
За вольны край і незалежны,
Мы за сваю ідзём Дзяржаву.

Няхай «фанатыкі» мы будзем,
Хаця-б патроіць трэба страты —
Што ўчора страцілі, здабудзем,
Сваю сабе збудуем хату!

І ДАЛЕЙ — БЕЗЬ ПЕРАКЛАДУ Й КАМЭНТАРАЎ

У дадатак да зьмешчанага ў папярэднім нумары «Бацькаўшчыны» пад загалоўкам «Безь перакладу й камэнтараў» падаём урыўкі з надрукаванае ў газэце «Обозрение», № 38 ад 11. 4. 48 зацемкі «Русский комитет Гросс-Гессена»:

«13 марта 1948 года в Бад Гомбурге состоялся съезд представителей местных комитетов Российских эмигрантов Гросс-Гессена.

Перад открытием съезда был отслужен молебен Его Высокопреосвященством Архиепископом Филофеем...

Представитель местного комитета от Ганау указал на тот национальный антагонизм, который сеют отдельные личности, называющие себя националистами самостийниками.

Представитель от Альсфельда указал в своем выступлении, что он является по своему происхождению украинцем, но, зная историю происхождения российского народа (малороссов, белоруссов и великороссов) от общих предков, считает этот народ единым неразедельным...

Представитель местного Франкфуртского камитета заявил, что он является по происхождению белоруссом, но он себя не отделяет от русских...

Перад закрытием съезда с напутственной речью выступил Его Высокопреосвященство Архиепископ Филофей. Он в своей речи призывал всех участников съезда относиться ко всем россиянам одинаково с уважением, вниманием и любовью. Чтить заповедь Иисуса Христа: «Люби своего ближнего, как самого себя». «Будем просить Бога, чтобы Он послал нам поддержку и образумил людей уважать и любить друг друга; прекратить национальные распри между нашими народностями. Тогда наступит мир и тишина»...

ЦІ ЗОЙМУЦЬ ЯНЫ ЭЎРОПУ?

(З часапісу «Newsweek», The US Magazine of news significance, March 29, 1948, P.P. 14-17).

Апошнімі тыднямі, калі напружаньне між заходнімі хаўрусьнікамі й Расейцамі паглыблялася бадай штодня, перад дыплёматамі пачало выростаць гэтае войстрае пытаньне. Борзды адказ, які блізу што заўсёды даваўся на яго ў Заходняй Эўропе і ў Задзіночаных Штатах Амэрыкі, быў — «але».

Гэты адказ падобны да бальшыні цьверджаньняў агульнага характару, тым ня менш ён тоіць у сабе шмат небясьпечнасьці. Ён не бярэць на ўвагу вайсковых фактараў, якія, у баку ад вышэйшага разьвязаньня вайны або міру, маглі-б зрабіць такія савецкія дзеяньні магчымай вайсковай і палітычнай памылкай. Гэтыя фактары ўлучаюць у сябе час, канечна патрэбны дзеля заняцьця Эўропы, супрацьў, які быў-бы пры гэтым, тэрыторыі, якія ўтрымваліся-б Захадам дзеля правядзеньня контрнаступу ды іншыя мерапрыемствы супрацьдзеяньня, што маглі-б быць выкарыстаныя супраць Расеі.

«Newsweek» запрасіў свае аддзелы ў Лёндане, Парыжы, Бэрліне й Вашынгтоне даць свае меркаваньні што да гэтага пытаньня. Галасы гэтых аддзелаў далучыліся да бязраднага абраза, апрача аднаго, менш сумнага, чымся пляскаты адказ «але».

Вялікія батальлёны

Усе чатыры сталіцы ў поўнай згодзе што да сілаў, якія былі-б выкарыстаныя, калі-б вайна ўзгарэлася ў Эўропе. З аднаго боку стаіць чырвоная армія. Гаспадарствавы сэкратар абароны ЗША Джэмс Форэстэль надоечы ацаніў расейскую армію колькасна на 100 дывізіяў, плюс 75 дывізіяў сатэлітавых гаспадарстваў. Эўрапейскія крыніцы ацэньваюць адны расейскія наземныя сілы на 165 дывізіяў. Зь іх 76 у Эўропе, разьмешчаныя гэтак: 1) Нямеччына — 18, 2) Польшча — 4, 3) Балтыцкія гаспадарствы — 15, 4) Фінляндыя — 12, 5) Румынія — 4, 6) Аўстрыя — 3, 7) Вугоршчына — 8, 8) Баўгарыя — 10, 9) Югаславія — 2. Іншыя крыніцы сьветчаць, што савецкія войскі на перыфэрыі ў эўрапейскай частцы Расеі і ў сатэлітавых гаспадарствах налічваюць каля 200.000 чал. Ладны працэнт гэтых войскаў — на цэнтрах вышкалу вакол прыпяцкіх балатоў.

Да якое ступені гэтая армія гатовая да баёвых дзеяньняў? Бэрлінскае бюро «Newsweek» рапартуе гэтак: 17 дывізіяў, якія фармавалі-б ударны кулак расейскага наступу ў кірунку Захаду, паводля ўсіх меркаваньняў, мэханізаваныя куды лепш, чымся перадавыя расейскія войскі апошнімі тыднямі мінулае вайны.

Лёндан і Вашынгтон не бяруць на ўвагу і ўважаюць за зусім пазбаўленую значэньня расейскую заяву пра дэмабілізацыю дзьвюх катэгорыяў, бо гэта — заходы звычайнага парадку.

У нумары ад 21. 3. лёнданскага «Сэндэй Обсэрвэр» спэцыялісты ў савецкіх справах Эдвард Крэнкшоў заявіў, быццам былі сьветчаньні таго, што адборныя часткі савецкае арміі на працягу некаторага часу прайшлі радыкальную рэарганізацыю і перашкоденьне ў сваіх ваенных акругах.

Крэнкшоў пісаў: «Увесь націск робіцца на рухомасьць і паветраную здольнасьць войска. Частквава, бязумоўна, як адказ на атомную бомбу, там праводзіцца перагрупаваньне, каб зрабіць камандаваньне кажнае арміі здольным функцыянаваць цалкам незалежна й цалкам забясьпечваць сябе прамысловымі прадпрыёмствамі, згрупаванымі зраўнаважаным спосабам па раёнах іхных галоўных гаспадаў. Таму здаецца, што вялікая частка запраўднае баёвае арміі СССР — не ў Эўропе, а перашкольваецца й пераўзбройваецца ў глыбі савецкае тэрыторыі. Калі яна будзе гатовая да дзеяньня — загадка кажнаму, але бадай пэўна, што ня будзе гатовай да заканчэньня першага паваеннага пяцігодавага пляну ў канцы 1950 г.».

Другі бок

Пярэклік наземных сілаў па адчыненым баку зялезнае заслоны гучыць як пярэклік слабасьці. Сілы гэтыя разьмешчаныя такім парадкам:

Нямеччына. Амэрыканскія аддзелы ў Нямеччыне й Аўстрыі налічваюць каля 30.000, пераважна пехаты, якой не стае танкавага й авіяцыйнага падтрыманьня з прычыны паваенных палітыкі ашчаджаньня бэнзыны й коштаў утрыманьня высакамэханізаваных злучэньняў.

Брытанскія аддзелы ў Нямеччыне й Аўстрыі ў бальшыні выконваюць паліцыйныя функцыі й складаюцца пераважна з маладога набору, выпраўленага зь Вялікабрытаніі па трохмесячным вышкале.

Францыя. Цяперашняя французская армія складаецца з набораў 1947 і 48 г.г. слаба вышкаленых кадраў. Колькасна яна даходзе прыблізна да 600.000 чал., улучна з жандармэрыяй (без паліцыі) ды гвардыяй, расьцярушаная ўсюды па Францыі, Паўночнай Афрыцы, акупацыйных зонах Аўстрыі й Нямеччыны. Да таго-ж —140.000 чал. з агульнае колькасьці — у Інда-Кітаі й на Мадагаскары. Армія мае ўсяго 7 малых танкавых злучэньняў, узброеньне якіх — пераважна застарэлы матар'ял, раней атрыманы ад Амэрыканцаў. Паветраныя сілы нязначныя.

Брытанія. Агульная баёвая сіла, што ёсьць цяпер у распарадзе брытанскае арміі, складаецца зь дзьвюх пехатовых дывізіяў, адное танкавае брыгады, аднае парашутнае брыгады й аднаго танкавага палка. Апрача таго, Брытанія цяпер ня школіць эўрапейскага экспэдыцыйнага корпусу.

Іншыя. Із 150.000 галяндзкае арміі — 120.000 цяпер у Інданэзіі. Бэльгійская армія налічвае ўсяго 65.000 чал. зь нязначным узброеньнем, і цяпер у стане рэарганізацыі. Гішпанія мае добра вышкаленую армію, але ўзброеную застарэлай зброяй.

Разьвіцьцё вайны

Вышэй мы накідвалі вайсковы абраз, але як-жа разьвівалася-б, неўспадзеўкі выбухнуўшы, вайна ў Эўропе? Нашыя аддзелы прыслалі гэткія адказы, як пэрспэктывы:

Лёндан. Усялякі аналіз магчымых ваенных дзеяньняў у Эўропе мусіць быць пачаты заявай, што на думку добрапаінфармаваных крыніцаў небясьпека вайны яшчэ не навісла. Праўда, апошнімі тыднямі яна наблізілася. З пазьнейшых крыніцаў падаецца, што Брытанскі Генэральны Штаб надоечы выпрацаваў сваю думку што да пэрыяду мірнага зацішку пры сусьветнай дыспазыцыі ад 10-6 год як максымум і да 4 год як мінімум. Брытанская Рада Паветраных Сілаў пастанавіла, што яна мае йшчэ час пераўзброіць свае бамбардавальныя сілы. Калі надыйдзе вайна, дык магчыма, што Расейцы, паводля стратэгіі, будуць здольныя да клясычнага маршу праз Нямеччыну, нізінныя краі й Францыю. Ад мамэнту, калі яны разгарнуліся-б на вельмі шырокім фроньце, яны наносілі-б удары на адным кірунку датуль, пакуль ня ўгразьлі-б там, а пасьля спрабавалі-б іншы кірунак. Такім парадкам, адбываліся-б пераменныя атакі ад Нарвэгіі да Адрыятычнага мора. А ад мамэнту, калі-б яны займелі наўдачы або запынкі, мяркуюць, што іх сустрэлі-б клопаты ў вялікім маштабе ад мясцовых партызанаў, якія пляжылі-б іхныя лініі матар'яльнага забясьпечаньня. Адна аўтарытэтная асоба заяўляе, што калі Заходняя Эўропа станецца валатоўскім Дункеркам, дык Гішпанія сфармуе мост для адваяваньня Эўропы. Яна мяркуе, што ў нашых собскіх інтарэсах мы павінны былі-б адкінуць прыкрыя ўспаміны аб франкаўскай палітыцы й аднавіць прыязьнь із Гішпаніяй.

Ангельска-амэрыканскія морскія сілы ў Міжземнамор'і маглі-б быць цалкам выкарыстаныя, пры кантролі гішпанскіх базаў, навет калі-б Італія й Францыя былі-б згубленыя.

(Працяг будзе).

Па кутках эміграцыі

УДАЛЫ ПАЧАТАК

Вясна. Аджыла ўся прырода, аджылі й нашыя дэпістыя, а найбольш моладзь. Для яе шырака адчыніліся дзьверы спорту — аднаго з найулюбёнейшых заняткаў моладзі.

18 красавіка ў лягеры Міхэльсдорф настаўнікам спорту сп. Мухам быў наладжаны «дзень адчыненьня спорту». А 3-й гадз. папаўдні на лягерным спартовым пляцы пачаліся выперадкі ў бегу на 100 м. і скачкох у далячыню ды ў вышыню. Пераможцам раздаваліся дыплёмы й сьціплыя падарункі із скаўцкіх фондаў. Вось вынікі выперадкаў:

Бег на 100 м.: дзяўчаты — Малеш Вольга — 16,5 сэк. I месца, дыплём; Харытончык Зіна — 18 сэк. — II месца, шакаляда; хлапцы — Пагуда Хведар — 12 сэк. — I м., дыплём; Каранеўскі Міхась — 12,5 сэк. — II м., мармаляда, Станкевіч Вяч. — 13 сэк. — III м., цукеркі; хлапцы малодшыя — Шыбут Віталь — 15 сэк. — I м., дыплём; Русак Васіль — 16 сэк. — II м., шакаляда; Фёдараў Адзік — 17 сэк. — III м., цукеркі.

Скачкі ў далячыню: малодшыя дзяўчаты — Харытончык З. — 232 цм. — I м., дыплём; Малеш В. — 305 цм. — II м., шакаляда; сярэднія й старэйшыя дзяўчаты — Харытончык Лёдзя — 343 цм. — I м., дыплём; Ворса Ала — 323 цм. — II м., шакаляда; хлапцы малодшыя — Шыбут В. — 409 цм. — I м., дыплём; Русак В. — 344 цм. — II м., шакаляда; Палонскі — 360 цм. — III м., цукеркі; юнакі — Пагуда Хв. — 519 цм. — I м., дыплём; Мікуліч Рыгор — 518 цм. — II м., шакаляда; Каранеўскі М. — 490 цм. — III м., цукеркі.

Скачкі ў вышыню: дзяўчаты-юначкі — Ляцяга Жэня — 115 цм. — I м., дыплём; Харытончык З. — 110 цм. II м., шакаляда; хлапцы — Русак В.—120 цм.—I м., дыплём; Самохін Сл. — 115 цм. — II м., шакаляда; юнакі — Мікуліч Рыгор — 155 цм. — I м., дыплём; Заруцкі Янка — 150 цм. — II м., шакаляда; Тарашкевіч Яўхім — 145 цм. — III м., цукеркі.

Пасьля гэтых выперадкаў адбыўся футбольны матч між скаўцкаю дружынаю «Штурм» і нямецкаю II дружынаю з Каму. Матч глядзелі, апрача лягерных жыхароў, Немцы зь с. Міхэльсдорф і г. Каму. Дармо, што былі неадпаведныя абставіны надвор'я, вецер і сонца ў вочы, — нашыя «штурмавікі» праз увесь першы раўнд трымаліся вельмі ўдала. Увесь час мяч быў на полі супраціўніка. I вынік — 0 : 0. У другім раўньдзе «Штурм» набраўся яшчэ большае зацятасьці й на працягу 30 час. загнаў у браму супраціўніка 6 голаў. Канчальны вынік — 6 : 0 на карысьць «Штурму».

Трэба адзначыць, што гульцы Толаш (абарона права), Шыбут Я. (абар. лева), Мікуліч (напад лева), Пагуда (напад права) і Говар (сярэдзіна) — гулялі вельмі ўдала й тэхнічна. Варта было-б ім трэнавацца й далей. Толаш загнаў 1 гол, Мікуліч — 2, Шыбут — 1 і Пагуда — 2.

Пад бурныя воплескі глядачоў маладым нашым футбалістым — бліскучым пераможцам над спрактыкаванымі нямецкімі гульцамі — закончыўся гэты вельмі ўдалы «дзень адчыненьня спорту».

Сэкундант.

МОЖА ВЫЙДЗЕ... А МОЖА Й НЕ?

Жыў-быў у Лютэнзэе адзін спадар. Жыў сабе й жыў. Нічым дужа не выдаваўся спаміж іншых. Хоць не... крыху выдаваўся. Пад ягоным кіраўніцтвам «казачий хор» (не мяшаць з казацкім) хоць не заўсёды складна, але моцна, выконваў «православный тихий Дон» і шмат іншых «здравиц» жывым і памёрлым «превосходительствам». I яшчэ: калі адбываліся агульналягерныя сходы, дык ён не даваў і разьзявіцца Беларусам, із патрэбаю й без патрэбы ўстаўляючы свой аргумэнт (на ягоную думку, мабыць, дужа паважны): «Да вы уже хорошо съагитированы против русских». Калі нас наведаў хор Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня, дык ён, сеўшы ў першым радзе, пасьля кажнае песьні сваім «громогласным» басам заяўляў, што «это все русские мелодии». Ну, але няхай яму Бог даруе, — мы ўсе людзі грэшныя.

I вось гэты спадар неяк зьнік зь лягеру. Людзі пагаварылі й кінулі, пагатоў, што й шкоды вялікае ня сталася. Беларусы ведалі, што цяпер калі й пачуюць якія-небудзь ня зусім прыемныя заўвагі пад сваім адрысам, дык ужо прынамся ад чужынца, а не ад «свайго», а Расейцы таксама вельмі ня плакалі, бо гэткія спадары аднаму пану доўга ня служаць.

I вось, за пару месяцаў, жыхары Лютэнзэе мелі шчасьце йзноў спаткацца з гэтым спадаром. Сярод суседзяў-Расейцаў пачалі хадзіць чуткі, быццам Лютэнзэе мае наведаць «белорусский» тэатр. «Ну што-ж, хоць і «белорусский», а ўсё-ж крыху й наш, — казалі дзядзькі зь Лютэнзэе, — няхай сабе прыяжджае, ато расейскі бывае дужа часта, а нашага, хоць-бы й бедненькага, як няма, так — няма».

Нарэшце зьявіўся кіраўнік гэтага даўгачаканага тэатру. I не падумайце, што абы-хто — гэны спадар у сваёй собскай асобе, ды яшчэ з адміністратарам. I вось яны ўдваіх пачалі «обделывать» фармальнасьці, зьвязаныя з паказам п'есы «Загубленае жыцьцё» (гл., між іншага, «Бацькаўшчыну» № 11 (14). I гэтыя фармальнасьці чамусьці «обделывались» у Расейскім Нацыянальным Камітэце, а Беларускі Нацыянальны Камітэт быў пастаўлены ўжо перад гатовым фактам. Тады Старшыня Бел. Нац. Кам. быў змушаны заявіць, што Беларусы ад гэтае справы атрасаюць рукі, бо культурным жыцьцём абедзьвюх групаў кіруюць паасобныя нацыянальныя камітэты, у сваёй групе кажны. I калі хто ў справе якоесь імпрэзы зварачаецца да Расейскага Нац. Кам., дык гэта значыць, што імпрэза будзе адбывацца першым чынам для Расейцаў.

I вось браточкі... у Міхэльсдорфе выйшла, а ў Лютэнзэе можа выйдзе... а можа й ня выйдзе? Адно толькі пэўна, што ўжо «воля» з «вызваленьнем» ладуць нам піць. Ой, дадуць! Божухна! Вось ужо пачэшуць гэтых «крывічэй»! Бо хто-ж, калі не яны, забаранілі выступаць «беларускаму тэатру», ды яшчэ пад слаўным кіраўніцтвам гэткага палкага патрыёта?

Бяда, дый годзе!

К. Лютэнзэйскі.

«НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПА ФОРМЕ»

Заснаваны ў 1945 г. пад самым Касэлем расейскі «трудовой» лягер-калгас Мэнхэгоф апошнім часам «преобразовывается» згодна з духам часу. «Преобразование» гэтае вельмі падобнае да таго працэсу, які правялі бальшавікі ў калішняй царскай Расеі. Тады, пад напорам вызвольных рухаў нацыяў, што адраджаліся на руінах расейскае турмы народаў, бальшавікі, хаця здушылі й залілі крывёю народныя рэспублікі Беларусі, Украіны й Каўказу, але змушаныя былі пайсьці на пэўныя ўступкі й на замену гэтых народных рэспублікаў стварылі фікцыі пад назовамі БССР, УССР і г. д. У гэтых рэспубліках-фікцыях павялася ўзмоцненая бальшавізацыя й русыфікацыя, апраненая ў форму клічу: «культура, нацыянальная па форме, а сацыялістычная па зьместу». Канчальны вынік быў той, што пасьля чверцьвяковага бальшавіцкага панаваньня іншанацыянальныя народы Расеі страцілі больш, чым за 150 гадоў царскае няволі.

Падобную работу заініцыявала цяпер партыя расейскіх салідарыстых у лягеры Мэнхэгоф, якая насьледвае бальшавіцкія мэтады. Калі летась паўсталі ў тутэйшым лягеры Беларускі і Украінскі Камітэты, дык партыя гэтая, маючы ў сваіх руках адміністрацыйны апарат, пусьціла ў рух усё, каб зьнішчыць гэтыя камітэты. Аднак, ня даўшы рады самі, салідарыстыя зарганізавалі із сваіх падгалоскаў г. зв. Беларускі Дэмакратычны Камітэт, які зладзіў пры ўдзеле апякуноў 14. 3. 48 першы (і мабыць апошні) канцэрт.

Праграма была чыста «расейская», вінігрэтная, з вальсам «над волнами» і «барыней». Навет да бальшавікоў не дараўнялі. Затое самагон плыў ракой. I гэта наваччу ў лягернага Камітэту з камандантам лягеру на чале, а навет і пары ўрадаўцаў IPO. Дармо, што два дні перад гэтым была вывешаная суворая забарона прадукаваньня й спажываньня самагонкі, якая страшыла карцэрам і пазбаўленьнем правоў ДП. Трэба-ж было даць зарабіць сваім халуём. Вынік быў той, што «канцэрт» закончыўся агульнай бойкай, у якой дасталося і лягернаму камітэту і працаўніку IPO.

Шылюк.

БЕЛАРУСЫ Й «ЗЯЛЁНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»

У № 11 (64) польскага тыднёвіка ў Нямеччыне «Кроніка»», у артыкуле пра «Зялёны Інтэрнацыянал» было пададзена, быццам нейкія беларускія колы ці то ў Парыжы, ці то ў Лёндане перадалі Паляком паўнамоцтвы рэпрэзэнтаваць інтарэсы Беларусаў у «Зялёным Інтэрнацыянале».

Вось-жа беларускае кіраўніцтва ў Парыжы паведамляе ўсё беларускае грамадзянства, што ніякіх паўнамоцтваў яно ані «зялёнаму», ані якому іншаму інтэрнацыяналу, ані якім-небудзь яшчэ іншым суседзкім ці нясуседзкім арганізацыям або асобам ніколі не перадавала.

Да беларускага кіраўніцтва ў Францыі дайшлі аднак весткі, што якісь Беларус, называючы сябе «Старшынёю Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады» ў Нямеччыне запраўды ўвайшоў у кантакт із «Зялёным Інтэрнацыяналам». Гэты Беларус не зьяўляецца сябрам Рады БНР, не знаходзіцца ў кантакце й ня мае ніякага дачыненьня да беларускіх арганізацыяў, падпарадкаваных Радзе і Ўраду БНР.

Беларускае кіраўніцтва ў Парыжы даручыла аднаму свайму сябру дасьледваць гэтую справу «паўнамоцтваў» у Парыжы і ў Лёндане. Вынікі будуць апублікаваныя ў «Бацькаўшчыне».

Парыж, 14. 4. 48 г.

З даручэньня ўсіх беларускіх арганізацыяў і ўстановаў у Францыі
інж. Л. Рыдлеўскі.

Ад рэдакцыі. У атрыманым намі «інфармацыйным бюлетэні» «За еднасьць» (№ 1, 15. 4. 48, Заўльгаў — франц. зона) зьмешчаны зварот «да кіраўніцтва Міжнароднай Сялянскай Арганізацыі, сэкцыя ў Лёндане», падпісаны якімсь «Старшынёю Цэнтральнага Камітэту Сялянска-Работніцкае Партыі Вызваленьня Беларусі» Юр'ем Сабалеўскім, у якім просіцца «падаць да публічнага ведама аб тым, якія Беларусы, або якія беларускія арганізацыі даручылі Паляком рэпрэзэнтаваць беларускія інтарэсы ў Міжнароднай Сялянскай Арганізацыі — сэкцыя Лёндан».

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

АД СТУДЭНЦКАГА СТЫПЭНДЫЯЛЬНАГА ФОНДУ

Увазе Студэнтаў Мэдыкаў Сяброў-Кандыдатаў АБЛЧ

Аб'яднаньне Беларускіх Лекараў на Чужыне

№ 56/48 Госьляр, 7. 4. 48.

Да Старшыні ССФ пры ЦБСА у Марбургу.

1. Урад АБЛЧ перадае на Вашыя рукі 1030 марак на ССФ, і аднача сна выказвае пажаданьне, каб з усіх сумаў, якія будуць ісьці на ССФ праз АБЛЧ былі ўстаноўленыя 2 адмысловыя стыпэндыі першае катэгорыі для студэнтаў мэдыцыны, фармацыі ці дэнтыстыкі, сяброў-кандыдатаў АБЛЧ. Стыпэндыі маюць быць выплачваныя паводля спосабу, усталенага ССФ.

2. Адначасна перадаюцца дзеля разданьня студэнтам мэдыкам, фармацэўтам і дэнтыстым наступныя рэчы, ахвяраваныя лекарамі-Беларусамі: 11 параў гумовых рукавіцаў, 3 шкляныя шпрыцы, 1 анат. лянцэт, 3 анат. пінцэты й 1 хірург. пінцэт. Гэтыя рэчы таксама маюць быць раздадзеныя тым студэнтам вышпералічаных факультэтаў, якія запісаліся сябрамі-кандыдатымі АБЛЧ ды іх патрабуюць.

Із сяброўскім прывітаньнем — **Старшыня.**

Управа ССФ падае гэта да ведама і ўстанаўляе тэрмін 20. 5. 48, да якога мусяць быць зложаныя заявы на гэтыя стыпэндыі й рэчы (паводля Статуту ССФ).

Управа ССФ пры ЦБСА

ДА СП. САКАЛОЎСКАГА ПРАЗ АДМІНІСТРАЦЫЮ «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»

Гэтым квітуем атрыманьне ад сп. Сакалоўскага 15 (пятнаццаць) н. м. на ССФ пры ЦБСА. Шчыра дзякуем за падтрыманьне беларускага студэнцтва, якое знаходзіцца на чужыне ў вельмі цяжкіх матар'яльных абставінах. Усё нашае старэйшае грамадзтва дапамагае свайму студэнцтву праз ССФ. Калі-б у Вашай мясцовасьці было-б троху Беларусаў, дык мы шчыра прасілі-б зьвязацца з намі ў справе наладжаньня там сыстэматычных збораў на ССФ. Усе матар'ялы, патрэбныя да гэтага, былі-б Вам перасланыя.

З глыбокай пашанай

Старшыня ССФ (подпіс)

НАРЭШЦЕ ВЫЙШАЎ З ДРУКУ ЛІТАРАТУРНА-ГРАМАДЗКІ ЧАСАПІС «САКАВІК»

№ 1 (2) за 1948 г.

У нумары: паэма Н. Арсеньневае, новыя вершы А. Салаўя, Я. Юхнаўца, М. Танка, М. Вярбы, Р. Крушыны, недрукаваныя дагэтуль вершы У. Дубоўкі, Л. Геніюш, У. Жылкі, мастацкая проза (навэлі, апавяданьні й да г. п.) В. Бірыча, Л. Вароніча, Н. Змагаркі, С. Хмары, М. Лагоды, З. Алесіча, драм. этуд А. Кавалеўскага, пераклады з Дэ-Лем'ена, Г. Гаўптмана, У. Сараяна, Г. Х. Андэрсэна, артыкулы М. Вольнага, М. Тэна, Р. Склюта, праф. Л. Акіншэвіча, С. Брагі, М. Грыбяля, зацемкі.

Цана 7.— н. м.

Выпісаць можна праз адміністрацыю «Бацькаўшчына».

Выйшла з друку

БЕЛАЯ КНІГА

Выпуск I

Цана 3.— н. м.

Выпісваць праз адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

УВАЗЕ БЕЛАРУСАЎ БЭЛЬГІІ!

Кальпартэрам газэты «Бацькаўшчына» на Бэльгію працуе спадар Барысік Пятро. Ягоны адрыс: Barysik P. 19. S. Donnay, Flemalle, Liege.

Цана газэты ў Бэльгіі 1 экз. — **5 бэльг. франкаў.**

У В А Г А!

БЕЛАРУСЫ Ў КАНАДЗЕ

могуць атрымаць газэту «Бацькаўшчына» ў спадара Pituška Joseph, General Delivery, Ottawa Ontario, Canada.

ШУКАЮЦЬ...

Кошт абвесткі — па аднэй марцы за кажнае паасобнае слова. Аплата наперад.

Сына **Міхалова** (21 год) з Браслаўшчыны, у 1944 г. быў у ваколіцах Фрайбурга — маці Міхалова Галена. Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Бацькоў **Жэрка Юльляна й Паўліну** зь Вялікае Лысіцы, Нясьвіскага раёну, і **знаёмых** — Жэрка Юльлян. Весткі на адрыс: (13 a) Schalkhausen 80, bei Ansbach.

Сыноў **Дубініна Івана й Мікалая,** нар. 1923 і 1926 г.г. — маці Дубініна Анастася. Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Караленку Міколу з жонкай Ядзьвігай і дачушкай Славай — кумы й сябры. Усіх, хто ведаў-бы пра іхнае месцазнаходжаньне — просьба паведаміць на адрыс рэдакцыі «Бацькаўшчыны».

Маці **Дуброўскую** Аляксандру й сёстраў Люсю й Вольгу — Сяргей. Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

20-цёх гадовы кавалер шукае інтэлігентную, разумную дзяўчыну з мэтай вымены думак. Зацікаўленым пісаць на адрыс рэдакцыі «Бацькаўшчына» пад дэвізам «Зорка».

Whiteruthenian Newspaper „The Fatherland“
Authorized by Headquarters European Command Civil Affairs Division APO 757, A. G. 383, 7 GEC-AGO.
Administration — (13b) Osterhofen, Ndby., Whiteruthenian D. P. Camp.
Printed by: Hils & Maier, Dingolfing, Bruckstraße 99.